УДК 81

**А.У. ШУЛЬМАН**

# РОЛЯ КОЛЕРААБАЗНАЧЭННЯЎ У РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КАНЦЭПТУ "МІНСК"

*У дадзеным артыкуле разглядаецца роля колераабазначэнняў у рэпрэзентацыі канцэпту "Мінск". Аўтар даказвае, што колераабазначэнні сучаснай беларускай мовы валодаюць значным стылёвым патэнцыялам, з'яўляюцца адным з асноўных кампанентаў моўна-выяўленчай сістэмы мастацкага паэтычнага тэксту. У артыкуле гаворыцца аб выкарыстанні колераабазначэнняў у функцыі мастацкай намінацыі, эксплікатару ацэначных уяўленняў паэта ў якасці асновы для стварэння пэўных стылістычных эфектаў. Артыкул грунтуецца на багатым паэтычным матэрыяле, які прааналізаваны метадам суцэльнай выбаркі, кампанентнага аналізу, супастаўлення значэння слоў; даецца лінгвапрагматычная характарыстыка колераабазначэнняў сучаснай беларускай мовы.*

## Уводзіны

Яшчэ са старажытнасці ў кожнага народа колер з'яўляўся адным са сродкаў асэнсавання свету. Ён служыў абазначэннем найбольш важнага ў прыродзе і найбольш каштоўнага ў чалавеку. Паколькі з часам колеравыя вобразы набылі эстэтычнае і духоўнае значэнне, з дапамогай колеру стала магчымым перадача не толькі ўнутранага свету чалавека, але і прадметаў жывой аб'ектыўнай рэчаіснасці. Феномен колеру – прадмет вывучэння многіх фундаментальных навук, аднак да гэтага часу ён не мае агульнай канцэпцыі як у межах якой-небудзь аднаой навукі, так і ў межах цэлага напрамку.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Мэта дадзенага артыкула – паказаць на матэрыяле беларускай паэзіі ролю колераабазначэнняў у стварэнні вобраза Мінска.

Свет бясколеравы, колеру ў прыродзе няма, ёсць уражанні аб нейкай рэальнасці, якая ўяўляецца ў колеравых адчуваннях. У выніку гэтага рэальнасць колеравага рада з'яўляецца ўяўнай [1, с. 45].

Псіхолагі сцвярджаюць, што колеравыя мадэлі, якія ствараюцца правым і левым паўшар'ем мозгу, не супадаюць – паўшар'і "аддаюць перавагу" розным часткам спектра і выдаюць прынцыпова розныя вынікі. У гэтым і ёсць парадокс колеру: ён заключае ў сабе магчымасці лагічнага і пачуццёва-вобразнага спосабу пазнання. Акрамя таго, псіхолагі звязваюць колер з эмоцыямі чалавека: у кожнай эмоцыі сваё пэўнае месца ў колеравай прасторы, гэта значыць кожная эмоцыя адпавядае пэўнаму колеру, а пэўны колер выклікае строга пэўныя эмоцыі. Таму, выкарыстоўваючы самыя разнастайныя колераабазначэнні, аўтары паэтычных радкоў малююць вобраз горада і адпаведна выклікаюць у чытача пэўныя эмоцыі.

Паводле даследаванняў А.А. Бадалёва, здзіўленне асацыіруецца з жоўтым, радасць – з чырвоным, стомленасць – з шэрым, страх – з чорным. Іншыя размеркаванні бімадальныя: так, гнеў – чырвоны і чорны, смутак – шэры і сіні, цікавасць – сіні і зялёны. Метад колераасацыятыўнага вывучэння можна прымяніць і ў даследаванні адносін асобы да асяроддзя, у якім яна жыве, у тым ліку і да горада. Для нас важна было высветліць, якія пачуцці звязаны з тым ці іншым колерам, якія эмоцыі і адносіны да свайго горада выклікае аўтар з дапамогай колераабазначэнняў.

Агульнавядомы і агульнапрыняты такія ўстойлівыя эмацыянальна-эстэтычныя значэнні колераў, як: сінія – найбольш лёгкія, халодныя, далёкія; зялёныя – найбольш нейтральныя, пасіўныя, спакойныя; жоўтыя – цёплыя, блізкія, перасцерагальныя; чырвоныя – цёплыя, блізкія, актыўныя, узбуджальныя, абцяжарваючыя; цёмныя паводле тону колеру – цяжкія, масіўныя, змрочныя; светлыя – лёгкія, спакойныя, чыстыя; маланасычаныя колеры – пасіўныя, спакойныя, сумнаватыя; ярка насычаныя – радасныя, актыўныя і г.д. Таксама колер з'яўляецца адной з канстант культуры, ён можа служыць своеасаблівай мадэллю развіцця, якая адлюстроўвае шляхі фарміравання, засваення, замацавання ў культурнай памяці не толькі агульных, але і нацыянальна афарбаваных культурна-значных канцэптаў. Без уліку значэння колеру нельга зразумець многія з'явы культуры.

Колер выступае адной з асноўных катэгорый культуры, якая фіксуе унікальную інфармацыю наконт каларыту навакольнай прыроды, своеасаблівасцей гістарычнага шляху народа, узаемадзеяння розных этнічных традыцый, асаблівасцей мастацкага бачання свету. Паколькі колер з'яўляецца кампанентам культуры, ён акружаны сістэмай асацыяцый, сэнсавых значэнняў, тлумачэнняў, становіцца ўвасабленнем разнастайных маральна-эстэтычных каштоўнасцей.

Змест, што кадзіруецца колерам, нацыянальна спецыфічны. Напрыклад, зялёнае ў ЗША – бяспека, а ў Францыі – злачынства, белы колер у кітайцаў – сімвал жалобы, смутку, а ў еўрапейцаў гэтыя функцыі выконвае чорны колер. Такім чынам, колеравая мова чалавека ментальная па сваёй прыродзе [2, с. 59]. За колерам людзі бачаць сэнс. Адсюль наша цікавасць колераабазначэнняў пры апісанні горада. У залежнасці ад таго, у чым бачыць чалавек прызначэнне горада і як вызначае сваё месца ў ім, адносіны да горада адрозніваюцца ў карэнных жыхароў і прыезджых, змяняюцца пад уздзеяннем узросту, адукацыі, роду заняткаў, полу [3, с. 212].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**Асноўная частка**

Разгледзім колераабазначэнне як спосаб стварэння вобраза горада на прыкладах з вершаў беларускіх аўтараў.

У вершах беларускіх паэтаў часцей за ўсё сустракаюцца наступныя колеры: чорны, белы, блакітны, зялёны.

У вершы Марыі Шамякінай "Мінскія імпрэсіі" колер узаемадзейнічае з іншымі з'явамі: гукамі, пахамі, рухамі, бо сучасны Мінск – гэта шум, агні, рэкламы, колеры і адценні. Ужыванне асіндэтону ў гэтым вершы дае магчымасць адчуць рытм жыцця горада. Узнікае адчуванне, што горад ззяе, блішчыць, пераліваецца ўсім спектрам колеру (колеры, адценні, фарбы, святлацені): *Гукі, колеры, адценні, пахі,/ Ліхтары, рэкламы, газа, дахі,/ Гукі – дахі, колеры – рэкламы,/ Газа – пахі, ліхтары – адценні,/Рухі, змены, фарбы, святлацені…* [Марыя Шамякіна "Мінскія імпрэсіі"].

Сустракаюцца творы беларускіх аўтараў, у якіх канцэпт колеру прадстаўлены абстрактна: "каляровасць", "рознакаляровасць", "адценні". Гэтая рознакаляровасць радасная, вясёлая, святочная: *Дзень каляровасцю страёў/ Спрагаўся з афарбоўкай кветак./ А іх на радасць жыхароў/ Нагадвала шчодра лета* [Максім Лужанін "У роднай сталіцы"]. *І ўсім нам, і людзям гасцінным/ Шматколерным роспісам сцен/ Гісторыю нашай краіны/ Раскажа метрапалітэн…* [Хведар Чэрня "Вялікай перамогі"].

У розных вершах сфера выкарыстання колераў у сімвалічным значэнні пашыраецца. Колераабазначэнні пачынаюць ужывацца для характарыстыкі прасторы і часу, становяцца абазначэннем пэўных сацыяльных груп: *Вакол яго будзёнасць шэрая/ Людскою паводкаю вірыла,/ А за спіной – Вялізным чэравам/ Шумеў, бурчэў паўдзённы рынак* [Пятро Прыходзька "Вулічны музыка"]. Частка колеравобразаў у кантэксце набывае другаснае сімвалічнае значэнне: *Свету ўсяму расказалі пра гэта не старажытныя кнігі, /А чорныя сцены пакут* [Васіль Вітка "Няміга"].

Вельмі актыўны ў апісанні Мінска чорны колер, які ва ўяўленні першабытных людзей асацыіраваўся з цемрай цёмнай ночы і магілы, распадам і смерцю, а значыць, і злом. Арыстоцель лічыў, што чорны колер – гэта колер хаосу, муці, дэзарганізацыі. Да гэтага часу за чорным колерам (супрацьлеглым жыццесцвярджальнаму беламу) замацаваны сімвалы зла, граху, цемры, пакутаў, няшчасця, хваробы і смерці.

У апісаннях Мінска чорны колер таксама сімвалізуе пакуты: *Вільготная гэтая зямля ад слёз,/ засмужаная ад удоўяй тугі,/ гаркотная ад чорнага дыму./ Колькі разоў ад яе адварочваўся лёс,/ колькі разоў яе пераворвалі смерці плугі,/ колькі разоў праганяліся прэч яе варагі, –/ злічыць немагчыма* [Віктар Ліўземніекс "Мінск. Плошча Перамогі"]. Часцей за ўсё чорны колер у вершах беларускіх аўтараў сімвалізуе вайну, смерць, разбурэнне, гора людское, зло: *Праз цэлы дзень гулі зенiткі./ У бомбы злітыя агні/ І зло, спрасаванае ў пліткі,/ Знішчаючы жыццё й набыткі,/ Ляцелі з чорнай вышыні.* [Пятро Глебка "Дзень вайны"]. Чорнай становіцца нават вышыня неба – настолькі страшная і разбуральная для горада вайна. Чорны колер – гэта напамін аб вайне, якая пакінула пасля сябе руіны гарадоў: *Как нам было больно,/ Не расскажешь ныне:/ Срубленные клены,/ Черные руины* [Кастусь Киреенко "Улица Зеленая"]. Іншы раз чорны колер не прама названы, а дадзены праз аб'екты, якія атрыбуцірують чарнату: *Абкураны дымам, абсыпаны сажай,/ Як прывід, ляжаў ты, паніклы ад гора. А надпіс на сценах: "За сажанем сажань,/ За каменем камень – адновім наш горад!* [Ніл Гілевіч "Абкураны дымам, абсыпаны сажай…].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Паводле сваёй сімволікі з чорным зблiжаецца ў апісанні горада шэры колер. Шэры колер часта ў паэзіі беларускіх аўтараў – гэта колер попелу, руін, разбураных дамоў: *І заняліся скрозь пажары – /Гарэў завод, кнігарня, дом…/І дыму шэрыя стажары,/І пах удушлівае гары/Заслалі горад палатном* [Пятро Глебка "Дзень вайны"]. *Яшчэ мы вёдрамі ў кватэры/ Ваду са Свіслачы насілі,/ Па вуліцах, ад пылу шэрых,/ Яшчэ трамваі не хадзілі…* [Пятро Прыходзька "Мінску"]. Блізкі паводле семантыкі да шэрага "сівы і стальны" колеры, якімі часта замяняецца ў вершах шэры: *Калі ж атуліць крылом/ Хмарка прастор сівы,/ З'яўляецца першы гром – / Хросны бацька травы…*[Еўдакія Лось " Вясна майго горада"]. *А мне ўспамінаецца сорак чацвёрты:/ Руіны, пажарышчы, попел сівы;/ Дашчэнту разбураны ўвесь, ды не мёртвы!/ Агнём зруйнаваны датла – і жывы!* [Ніл Гілевіч "А мне ўспамінаецца сорак чацвёрты…"].

Шызы колер у вершах беларускіх паэтаў – гэта старажытнасць, гісторыя, вайна, сівыя хмурныя гады: *Беларусі роднае сталіца!/ У сівой смузе тваіх гадоў/ Зіхацяць стальныя бліскавіцы…* [Кастусь Кірэенка "Вуліца Янкі Купалы"]. *І нам не сорам Мінскам пахваліцца./Ды хочацца часамі нахіліцца/ Над скруткам старажытнасці сівой…* [Пімен Панчанка "Слова пра Мінск"]. *Між сівымі, хмурымі гадамі –/ Шмат прыходзіла чужацкіх зграй –/ На Нямізе клалі іх снапамі* [Пятрусь Броўка "Ґераічны і вечны"].

Чым часцей малюецца вобраз сучаснага Мінска, тым больш у вершах ужываецца белы колер – ён сімвалізуе ўсё добрае, гэта колер чысціні, святла: *У тых, што ўжо даўно стаяць,/ У тых, што беляць твар цагляны, –/ Усюды праца ёсць мая…* [Максім Лужанін "У роднай сталіцы"]. Белыя не толькі дамы ў горадзе, але і птушкі (чайкі): *Адкуль яны, белыя, белыя,/ Які іх занёс сюды лёс – / Пад Мінск, дзе калоссі даспелыя/ Шумяць ля задумных бяроз?...* [Пятро Прыходзька "Чайкі над Мінскам"]. *На Беларусь ляцяць марскія чайкі,/ На белых крылах несучы вясну./ А там, пад Мінскам,/ Мора ў сонцы майскім/ Бярэ з нябёс раздольную красу* [Пятро Прыходзька "Ляціце, чайкі"].

Найбольш частотным у сучасных вершах аб Мінску паўстае светлы колер. *Заціхнуў Мінск./ Але ў глухой начы/ Святлее ранак новы, урачысты…/ І шлях яго сатканы з промняў светлых./ Сваю сталіцу славіць родны край,/ Жыве наш Мінск у рытмах працы звонкіх,/ Па новых вуліцах спяшаецца трамвай…* [Мікола Хведаровіч "Заціхнуў Мінск…"]. *Вучуся светласці ў рачулкі,/ Што прамывае вечны глей;/ А ўзнёсласці – ў вежаў гулкіх,/ А добрым думкам у людзей!* [Еўдакія Лось "Мінчанка"]. Разам са светлым, узмацняючы і вылучаючы яго, выкарыстоўваюцца і іншыя колераабазначэнні, якія ствараюць светлы і празрысты вобраз горада: *Светлы, празрысты/ Наш горад! Ён светлы, вячысты./ Яму і далей прыгажэць./ Наш горад! Як гімн, урачыста/ Ён будзе ў стагоддзях звінець* [Хведар Чэрня "Вялікай перамогі"]. *Празрысты горад мой, як шклянка./ Ён чалавеку па плячу…/ Завуся з гордасцю мінчанкай –/ І ёй да сконцу быць хачу!* [Еўдакія Лось "Мінчанка"].

Менш актыўныя ў апісанні Мінска іншыя колераабазначэнні. Часцей за ўсё (акрамя чорнага, шэрага і светлага) выкарыстоўваецца чырвоны, ірдзяны, зялёны, жоўты: *Барока восені – мой улюбёны стыль/ Убраньняў паркавых, калі ярчэй, іскрысьцей,/ Чым дзень яшчэ ці два таму ірдзіцца лісце,/ І падае крылом, што абраніў матыль* [Серж Мінскевіч " Парк Горкі. Штыль"].

Зялёны колер лічыцца найбольш нейтральным, спакойным. Гэта інтравертаваны колер, складаецца з чырвонага, жоўтага і сіняга. У хрысціянскай сімволіцы ён асабліва значны, бо нагадвае аб зямным жыцці Хрыста, аб яго місіі. Гэта колер юнацтва, росквіту, вады. У вершах беларускіх аўтараў мы сустракаем зялёны колер даволі часта. З зялёным колерам у нас асацыіруецца ўся раслiннасць.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Побач з прыметнікам “зялёны” сустракаюцца і іншыя вытворныя (прозелень, зеляніна, зелень): *Над ім зіхціць святлісты дзень красавіковы,/ Над ім плывуць аблок празрыстыя чародкі,/ Галінкі ліп вось-вось успалыхнуць гатовы/ Вясновай прозелені полымем салодкім...* [Алесь Звонак “Ленінскі праспект”].

У чырвоным колеры першабытны чалавек пазнаваў кроў, агонь, цяпло, сонца. Ён сімвалізуе такія важныя для чалавека паняцці, як жыццё, сіла, энергія; ён абазначае ўсё, што падымаецца і ўзвышаецца над штодзённым, звычайным, таму чырвоны – колер цароў, багоў, жрацоў. Аднак у апісанні Мінска чырвоны і яго адценні становяцца сімвалам крыві, страт: *Плошчай свабоды/ Народ ганарыцца,/ Шэлестам сцягаў/ Тваіх баявых./ Нам не забыць/ Пра твае барыкады,/ Бруку твайго,/ Што абмыты крывёй* [Анатоль Астрэйка “Плошча Свабоды”]. *Многа злыдні мінчан расстралялі, / Перабілі людзей дарагіх./ Ад гарачай крыві раставалі,/ Чырванелі, гарэлі снягі* [Антон Бялевіч “ Горад-волат”].

Сіні колер амаль пазбаўлены сімвалічнай амбівалентнасці. Яго значэнне адзінае і ўстойлівае: ён сімвалізуе вечнасць, неба, паветра. У вершах беларускіх паэтаў, тым не менш, гэта не толькі блакітнае неба, але і блакітная, сіняя вада. Бо нездарма Беларусь называюць краінай блакітных азёр. Блакітны колер у горадзе – гэта сімвал чысціні, свежасці, міру і спакою. Таму ў апісанні Мінска дастаткова актыўныя сінія і блакітныя колеры: *Паблеклая хмара на Свіслач апала,/ Зямля рассцілае блакітны абрус./ Дык хай жа ў стагоддзях, наш родны Купала,/ Сны сняцца табе пра сваю Беларусь!* [Пятро Прыходзька “Ля помніка Янку Купалу”]. Сінім становіцца горад ад колеру вачэй беларусаў, якія традыцыйна асацыіруюцца з васількамі: *Сінеліся вачэй ільны,/ Звінелі слоў крыніцы./ Запас Мянескаў – валуны/ Пайшлі на камяніцы* [Рыгор Барадулін “Мянеск”]. Мінск малюецца блакітным, а гэты колер затым ўзмацняецца іншымі колераабазначэннямі, напрыклад, залатым: *Паўсюдна пратокі, каналы/ І новых азёр перазвон./ Яны, як з блакіту каралі,/ У сонечным золаце дзён* [Хведар Чэрня “Вялікай перамогі”].

**Заключэнне**

Такім чынам, у ходзе аналізу вершаў пра Мінск нашы назіранні паказалі, што *чорны* – гэта колер вайны, смерці, разбурэнняў; блізкія да яго паводле семантыкі *шэры* і *шызы* колеры – гэта колеры попелу, шэрых будняў, як сцвярджаюць псіхолагі, гэта слабыя і пасіўныя колеры; *чырвоны* часцей за ўсё асацыіруецца з крывёю, колерам нацыянальнага сцяга; *сіні* – не толькі колер неба, блакітных беларускіх азёр, але і колер вачэй беларусаў, якія робяць сінім і сам горад; *зялёны* – колер жыцця, вуліц і плошчаў Мінска.

Мы бачым, што з дапамогай колераабазначэнняў могуць выражацца адносіны чалавека да з’яў навакольнай прыроды, да любімага горада і яго людзей. Колер выступае тут у якасці змястоўнага элемента культуры, з дапамогай якога можна ахарактарызаваць, сістэматызаваць прадметы, сацыяльныя ўстаноўкі і маральна-эстэтычныя паняцці. Вобраз горада паўстае рознакаляровым: *А май зялёныя лісты / На ліпку кожную навешвае,/ Праспект маўчыць, праспект/ застыў,/ Прыбраны чырванню навейшаю./ І плошча – у жывым кальцы./ Я слухаю маўчанне грознае,/ І каравульныя байцы,/ Падобныя да статуй бронзавых.* [Юрась Свірка “ Мінск. Плошча Перамогі 9 Мая”].

Такім чынам, кожны з колераў валодае ўласным, часта пэўным эмацыянальна-асобасным значэннем. Але нельга сканцэнтроўваць сваю ўвагу толькі на традыцыйнай інтэрпрэтацыі асобных колераў, паколькі яны з’яўляюцца перш за ўсё перадачай індывідуальна-эмацыянальных асаблівасцей успрымання горада іх аўтарамі. Менавіта дзякуючы колераабазначэнням мы бачым сваю сталіцу Мінск

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

то строгім, то тужлівым, то святочным, то яркім. Колер тут – адзін з галоўных элементаў гармоніі жыцця ў горадзе. Гармонія паміж чалавекам і горадам вядзе да ўсеагульнай гармоніі свету і прыгажосці.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. ***Мостепаненко, Е.М.*** Свет в природе как источник художественного творчества / Е.М. Мостепаненко // Художественное творчество. –1986. – № 4. – С. 76.
2. ***Налимов, В.В.*** Языковое сознание / В.В. Налимов. – Москва: Прогресс, 1993. – 278 с.
3. ***Петренко, В.Ф.*** Основы психосемантики / В.Ф. Петренко. – Москва: Изд-во Моск. ун-та, 1997. – 398 с.

Паступіў у рэдакцыю 12.03.2009 г.